**КРЫЧАЎСКАЯ МІКАЛАЕЎСКАЯ ЦАРКВА,** помнік архітэктуры драўлянага дойлідства ў г. Крычаў. Пабудавана ў 1838. Падоўжна-восевую кампазіцыю фарміруюць асн. прамавугольны аб’ём, бабінец, апсіда з бакавымі рызніцамі. Гал. фасад асн. аб’ёму завершаны галоўкай на 8-гранным барабане. Бакавыя фасады гарызантальна ашаляваны, рачлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі ў ліштвах, вертыкальнай шалёўкай вылучана цокальная і фрызавая часткі фасадаў. Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Царква дзейнічае.